Прэзентацыі

# «Весніцы» ў літаратуру

**Літаратурнай суполцы "БУКет", што існуе ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў пры кафедры беларускай філалогіі і сусветнай літаратуры, сёлета споўнілася восем год. 12 снежня 2008 г. адбылося ўрачыстае пасяджэнне суполкі, прымеркаванае да выхаду чарговага зборніка прозы і паэзіі пад назвай "Весніцы". Калектыўныя зборнікі аб'яднання выходзілі штогод, і гэта ўжо сёмая кніга.**

Новы зборнік і чарговая сустрэча каторы раз аб'яднала разнастайныя "кветкі" ў адзін "БУКет": студэнтаў і выпускнікоў, выкладчыкаў і проста творчых сяброў суполкі.

Усе восем год праца "БУКета" шмат у чым залежала ад плёну і ідэйнага натхнення Алены Багамолавай, не проста цудоўнага выкладчыка, але і выдатнага філолага і паэтэсы, што была галоўным кіраўніком арганізацыі ад яе стварэння. Праз любую суполку, якая існуе на базе навучальнай установы, праходзіць вельмі шмат людзей, часам нават выпадковых. Але для многіх "БУКет" стаў своеасаблівай *творчай школай*, выгадаваў цэлае пакаленне творчых асобаў.

"БУКет" аб'ядноўвае не толькі маладых паэтаў і празаікаў. Тут ёсць месца музыкантам, мастакам, рэжысёрам... На пасяджэннях суполкі заўсёды гучаць песні ў выкананні маладых аўтараў. Так, і на прэзентацыі зборніка "Весніцы" з аўтарскімі спевамі пад гітару выступалі Алена Свечнікава, Павел Макееў ды іншыя. Калектыўную музычную творчасць прадставіў гурт "Па-за кадрам". Малады паэт Юрась Ленскі выступіў адначасова аўтарам тэкстаў і дэкламатарам у гурце. Напрыканцы прэзентацыі Алена Багамолава ўрачыста абвясціла П.Макеева новым кіраўніком суполкі.

**Адам ШОСТАК**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ